# Агляд падзей тыдня паводле афіцыйных крыніц ЕС

## Анонсы падзей 30 красавіка – 6 мая

**28-30 красавіка** – візіт высокага прадстаўніка ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан у М'янму. У апошні дзень візіта запланавана сустрэча Эштан з прэзідэнтам краіны Тейн Сейн. Праграма візіта

**3-4 мая** – у Брусэлі адбудзецца канферэнцыя па ўстойлівых інфармацыйных і камунікацыйных тэхналогіях, разумных энергетычных сістэмах і разумных гарадах. Удзельнікі жадаюць высветліць, як зрабіць гарады больш экалагічнымі праз ужыванне апошніх тэхналагічных дасягненняў. Больш падрабязна

**6 мая** – другі тур прэзідэнтскіх выбараў у Францыі, дзе за пасаду будуць змагацца цяперашні прэзідэнт краіны Нікаля Сарказі і кандыдат ад сацыялістаў Франсуа Аланд. У гэты ж дзень адбудуцца парламенцкія выбары ў Грэцыі, першыя ад пачатку эканамічнага крызісу.

## Падзеі мінулага тыдня

### ACTA: Як забяспечыць інтэлектуальную ўласнасць і недатыкальнасць асабістых дадзеных

Еўрапейскі інспектар па ахове дадзеных (EDPS) 24 красавіка агучыў сваё меркаванне наконт міжнароднага пагаднення па барацьбе з кантрафактнай прадукцыяй (ACTA). Інспектар папярэджвае, што недахоп дакладнасці ў справе аховы інтэлектуальнай уласнасці ў Інтэрнеце можа выклікаць непрадугледжаныя наступствы для асноўных правоў чалавека кшталту назірання за паводзінамі карыстальнікаў сусветнай павуціны ці за электроннай перадачай інфармацыі.

### ЕС падтрымлівае гістарычныя крокі Заходніх Балкан у справе бежанцаў

261 мільён еўра будзе выдаткавана ў межах праграмы "Рэгіянальнае жыллё", каб патрымаць бежанцаў на Заходніх Балканах. Дзякуючы праграме, пастаяннае жыллё атрымаюць 74 тыс. чалавек. 24 красавіка Боснія і Герцагавіна, Харватыя, Чарнагорыя і Сербія пацвердзілі свой намер знайсці доўгатэрміновыя рашэнні для бежанцаў, пацярпелых ад канфліктаў 1991-1995 гадоў.

### Еўрапарламент абмяркоўвае пашырэнне сферы прымянення падатку на фінансавыя транзакцыі

Прапанаваны падатак на фінансавыя транзакцыі павінен быць больш дакладным, каб ахапіць больш трэйдэраў і зрабіць ухіленне ад падатку невыгодным, адзначае рэзалюцыя камітэта Еўрапарламента па эканамічных і грашовых справах, прынятая 25 красавіка. Члены камітэта лічаць, што падатак павінен быць уведзены, нават калі некаторыя з краін ЕС ад яго адмовяцца.

### Еўракамісія заклікае Вялікабрытанію поўнасцю забяспечыць свабоду перамяшчэння грамадзян ЕС

Еўракамісія просіць Велікабрытанію прывесці сваё заканадаўства ў адпаведнасць правілам Еўрасаюза па свабодным перамяшчэнні грамадзян ЕС і іх сем'яў. У іншым выпадку Камісія будзе апеляваць да Еўрапейскага суда. Дырыктыва па свабодным перамяшчэнні павінна была быць цалкам перанесеная ў нацыянальныя правілы краін-сябраў ЕС да красавіка 2006 года, але пэўныя неадпаведнасці захаваліся дагэтуль.

### Эштан адкрыла Офіс ЕС у М'янме

Кэтрын Эштан, Высокі прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі, 28 красавіка ўрачыста адкрыла Офіс Еўрапейскага Саюза ў М'янме. "Я спадзяюся, вы будзеце ўспрымаць наш Офіс як сымбаль Еўрасаюза, яго 27 краін-сябраў, яго інстытутаў, што паказваюць прыязнасць ЕС да гэтай краіны і да палітычных працэсаў, якія цяпер адбываюцца", -- падкрэсліла Эштан у сваёй прамове.

### НАТА: Еўрасаюз павінен больш інвеставаць у бяспеку

Генеральны сакратар НАТА Андэрс Фог Расмусэн непакоіцца, што краіны Еўрасаюза недастаткова інвестуюць у справы бяспекі. Пра гэта ён заявіў падчас сустрэчы міністраў замежных спраў ЕС 23 красавіка. У сваю чаргу еўрадэпутаты задалі сакратару пытанні па сітуацыі ў Лівіі, падзеях у Сірыі і ролі ЕС у Афганістане пасля вываду войск у 2014 годзе.

### Праект бюджэта 2013: інвестыцыі ў рост эканомікі і павелічэнне колькасці працоўных месц

Праект бюджэта на 2013 год, які Еўракамісія прадставіла 25 красавіка, паказвае, што рост эканомікі і павелічэнне колькасці працоўных месц у Еўрасаюзе могуць быць дасягнутыя толькі праз спалучэнне фінансавай кансалідацыі з інвестыцыямі ў далейшы рост. Праект

прадугледжвае скарачэнне штату Еўрапейскай Камісіі і выдзяленне 62.2 млрд. еўра на стварэнне новых працоўных месц у ЕС.

## Прэзідэнт Еўрапейскага цэнтрабанка аб праграме ліквіднасці і эканамічнага росту

Еўразона ўсё яшчэ знаходзіцца ў “найбольш складанай фазе працэса”, але рост, выкліканы замежным попытам і дзеяннямі Еўрапейскага цэнтрабанка, хутка пачнецца, запэўніў еўрадэпутатаў прэзідэнт ЕЦБ Марыа Драгі. Еўрапарламентарыі ў сваю чаргу папрасілі праінфармаваць іх пра размеркаванне сродкаў ЕЦБ, выдзеленых для еўразоны, і заклікалі ЕЦБ быць больш гнуткім у справе стымулявання эканамічнага росту.

## Дэфіцыт бюджэта ў зоне еўра знізіўся да 4.1%

У мінулым годзе дэфіцыт бюджэта краін зоны еўра знізіўся ў параўнанні з 2010 годам. У еўразоне паніжэнне адбылося з 6.2% да 4.1% валавага ўнутранага прадукта, а ў Еўрасаюзе цалкам з 6.5% да 4.5%. У той жа час дзяржаўны доўг, наадварот, вырас: у еўразоне да 87.2% ВУП, а ў ЕС - да 82.5%.

## Заробак у ЕС вагаецца ад 3.5 да 39.3 еўра за гадзіну

Паводле дадзеных Еўрастата, у Еўрасаюзе сярэдні заробак за гадзіну ў мінулым годзе склаў 23.1 еўра, а ў краінах з адзінай еўрапейскай валютай гэты паказчык быў 27.6 еўра. Аднак гэтыя лічбы хаваюць значную розніцу паміж членамі ЕС, дзе заробак вагаецца ад 3.5 еўра ў Балгарыі да 39.3 еўра ў Бельгіі.

## Еўрапарламент спрабуе вырашыць праблему беспрацоўя моладзі

Камітэт занятасці і сацыяльных спраў Еўрапарламента 24 красавіка прыняў рэзалюцыю па барацьбе з беспрацоўем моладзі. Парламентарыі прапанавалі пераразмеркаваць структурныя сродкі ЕС, выдзеленыя для пэўных праектаў, каб стварыць больш працоўных месцаў для моладзі. Дэпутаты таксама прапанавалі ўвесці гарантыю, што маладыя грамадзяне ЕС не застануцца без працы больш, чым на чатыры месяцы.

## ЕС выказвае занепакоенасць сведчаннямі пра неналежнае абыходжанне з Юліяй Цімашэнка

Абыходжанне са зняволенай Юліей Цімашэнка ды іншымі палітыкамі стала галоўнай тэмай сустрэчы камісара па справах пашырэння і еўрапейскай палітыцы суседства Штэфана Фюле з першым віцэ-прэм’ерам Украіны Валерыем Харашкоўскім. Фюле выказаў глыбокую занепакоенасць у сувязі апошнімі навінамі пра абыходжанне з былым

прэм’ер-міністрам і настаяў, каб украінскія ўлады неадкладна высветлілі, што здарылася са зняволенай па дарозе з турмы ў шпіталь.

**Праграма для моладзі Ўсходняга партнёрства прымае заяўкі ўдзел у семінары па міжнародным партнёрстве**

Распачаўся прыём заявак для ўдзелу ў семінары па ўсталяванні партнёрскіх сувязяў падчас выканання праектаў, што будуць прадстаўленыя ў межах праграмы “Моладзь у дзеянні” і ініцыятывы Ўсходняга партнёрства “Акно для моладзі”. Мерапрыемства арыентавана на недзяржаўныя арганізацыі, якія працуюць з моладдзю і жадаюць прыняць удзел у праграмах ЕС. Заяўкі прымаюцца да 18-га траўня.

*Агляд падрыхтаваны Цэнтрам еўрапейскіх даследванняў для Прадстаўніцтва ЕС у Беларусі*